УДК 94 (476) «1919»

# ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ САКАВІКА-ЛІПЕНЯ 1919 Г. У ПІНСКУ

***Сяргей Ісакаў***
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца ваенна–палітычная сітуацыя сакавіка–ліпеня 1919 г. на тэрыторыі Піншчыны. Асаблівая ўвага надаецца заняццю польскімі войскамі г. Пінска і расстрэлу палякамі яўрэяў горада. Артыкул арыентаваны ў першую чаргу для спецыялістаў–даследчыкаў гісторыі польска–савецкай вайны, гісторыкаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі

***Ключавыя словы : ваенная адміністрацыя, палявая жандармерыя, самакіраванне***

Падзеі польска–савецкай вайны (1919–1921 гг.) ў айчыннай гістарыяграфіі з'яўляюцца маладаследаванай тэматыкай. У савецкі час падзеям вайны надавалася менш увагі, бо гэтая вайна лічылася прайгранай. Сітуацыя змяняецца ў 1985 г. пад уплывам правядзення палітыкі перабудовы. Публікуюцца манаграфіі даследчыкаў па дадзенай праблеме. Сучасныя айчынныя даследчыкі вывучаюць польска–савецкую вайну ў генезісе яе развіцця. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у даследчыкаў пачала ўзнікаць цікавасць да вывучэння рэгіянальнай гісторыі. Якая закранула праблему польска–савецкай вайны на тэрыторыі Палесся, Віленшчыны і Гродзеншчыны і г.д. У выніку высветлівалася, што ў рэгіёнах Беларусі па рознаму ўсталёўвалася акупацыйная ўлада, выбіраліся органы кіравання і самакіравання.

Адна з першых звестак аб падзеях польска–савецкай вайны з'явілася ў турыстычным зборніку "В походе по Пинщине" выдадзеным у 1958 г. у Пінску пад рэдакцыяй А. Лазіцкага [1], дзе змешчана гістарычная даведка аб барацьбе за савецкую ўладу на Піншчыне. Другая кніга, прысвечана рэгіянальнай гісторыі – "Памяць" [2], якая сабрала ў сябе матэрыялы па гісторыі за ўвесь перыяд існавання г. Пінска і яго ваколіц. У раздзеле "1917–1941 гг. На крутым павароце гісторыі" падаецца інфармацыя аб падзеях

Репозиторий ПолесГУ

польска–савецкай вайны ў г. Пінску. Новай крыніцай, па вывучэнню праблемы польска–савецкай вайны і Піншчыны, з’яўляецца калектыўнай манаграфіі “Пінск ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання [3]”. У якой беларускія гісторыкі А. Літвін і А. Трубчык прысвяцілі 6 раздзел “Пінск у гады польска–савецкай вайны”.

Акрамя беларускай гістарыяграфіі, падзеі польска–савецкай вайны асвячаюць польскія гісторыкі, з свайго пункту гледжання на дадзеную праблему. У манаграфіі “Usypać góry. Historie z Polesia [4]” польская даследчыца Маргарыта Шэйнерт спрабавала аб’ектыўна прааналізаваць падзеі ўзяцця польскімі войскамі Пінска і асвятліць расстрэл польскімі салдатамі яўрэйскага насельніцтва.

Новымі крыніцамі па вывучэнню дадзенай праблемы з’яўляюцца матэрыялы Архіва новых актаў у г. Варшаве [5], і газета “Unja” [6], якая выдавалася ў г. Пінска ў 1919 г.

Пасля заняцця польскімі войскамі Брэста 10 лютага 1919 г. Падляшская група пад камандаваннем генерала А. Лістоўскага заняла ў наступныя дні Макраны, Кобрын і Пружаны. Пасля заняцця Антопаля (у канцы лютага), польскае камандаванне перад А. Лістоўскім паставіла задачу, захопу Пінска. Наступленне на Пінск працягнулася ў пачатку сакавіка 1919 г. Апоўдні 5 сакавіка 1919 г. група з 4 батальёнаў 22 і 34 пяхотнага палка на чале з маёрам Аляксандрам Лучынскім падышла да Пінска і пачала артылерыйскі абстрэл горада [3, с. 400]. У дапамогу наступленню Падляшскай групы быў пасланы лідскі батальён стральцоў. У выніку непрацяглага бою, Пінск быў захоплены польскімі войскамі [2, с. 177].

**Малюнак 1. Схема захопу польскімі войскамі г. Пінска 5 сакавіка 1919 г.**




У ходзе вясеннега наступлення польскіх войск, было цалкам занята Палессе. Па здабыццю Пінска пачалася арганізацыя польскай ваеннай адміністрацыі. Улада знаходзілася ў руках палявой жандармерыі і камісарыяту на чале з маёрам А. Лучынскім. Для навядзення парадку ў горадзе былі уведзены : каменданцкая гадзіна, забаронена мітынгаў і маніфестацый і г. д. Да чэрвеня 1919 г. на Піншчыне дзейнічалі органы “самакіравання” (магістрат) пад наглядам польскага войска. Польская ваенная ўлада кіравала Пінскам да 1 ліпеня 1919 г. У адрозненне ад іншых тэрыторый, дзе польская ваенная адміністрацыя перадава ўладу ў рукі грамадзяскага ўпраўлення хутчэй. Гэта можна патлумачыць, тым што Пінск з’ўлялся стратэгічным аб’ектам для польскага войска.

7 чэрвеня 1919 г. Грамадянскае Упраўленне Усходніх Зямель (ГУУЗ) стварыла Брэсцкую акругу на чале з акруговым камісарам Антонам Ваеводзкім, і яго намеснікам Мечыславам Інэсам. Аднак, акруговы камісар не мог дзейнічаць без згоды ваеннага камандавання Літоўска–Беларускага фронту і падпарадкоўвался начальніку группы войск А. Лістоўскаму [8, с. 74].

Польская ўлада была зацікаўлена ў устанаўленню грамадзянскай улады. Прычыны гэтага заўсёды паходзілі ад паводзін польскага войска на захопленных тэрыторыях : пастаянныя рэквізіцыі, беспадстаўныя арышты, яўрэйскія пагромы. Не адрознілася паводзінамі і палявая жандармерыя, якая кіравала захопленай тэрыторыяй, як ваенная адміністрацыя. Усе гэта фарміравала погляд мясцовага насельніцтва на палякаў, як на ворагаў. Польская ўлада была зацікаўлена ў тым, як перадаць уладу грамадзянскай уладзе, каб прыцягнуць на свой бок мясцовае насельніцтва. Для падтрымання парадку, павінен быць створаны грамадскі орган – паліцыя. Аднак на тэрыторыі Палесся гэты працэс зацягнуўся, калі "de jure" улада была ўсталявана вясной, то "de facto" яна была ўсталявана толькі летам.

5 красавіка 1919 г. па вуліцы Альбрэхтоўскай ( вул. Купецкай, зараз вул. Кірава) адбыўся сход яўрэяў, на якім раздавалі прадуктовыя наборы і грошы ад амерыканскай арганізацыі "Joint" [4, с. 300]. У камісарыят горада звярнуліся два польскіх салдаты, якія паведамілі, што сёння ў субботу ў "Народным доме" адбудзецца сход сіяністаў [7, с. 544]. Акрамя гэтага ў ваенную адміністрацыю паступіла інфармацыя аб бальшавіскай агітацыі. У дом уварваліся польскія жаўнеры, дзе некаторыя з іх пачалі рэквізіраваць прадукты і грошы ад чальца "Joint" Цукермана. Многія да таго моманту разышлісь, аднак палякі пачалі водыск. Некаторыя яўрэі пачалі хавацца ў доме, гэта раз'юшыла польскіх салдат. У гэты момант на другім паверсе адбыўся стрэл, польскі салдат паведаміў што ў яго стралялі. Палякі схапілі ўсіх, каго ў той момант змаглі затрымаць, і павялі на плошчу. Прывёўшы 35 затрыманых яўрэяў да касцёла святога Станіслава, паставілі да сцен кляштара. Па камандзе афіцэра, яўрэі былі расстраляныя. На наступны дзень, польскі афіцэр апытваў усіх, хто быў у "Народным доме". У выніку чаго, у справаздачах польскія ваенныя пісалі, што гэта былі бальшавікі. Для палякаў здарылася неспадзяванка, сярод яўрэяў быў чалец з "Joint", які верагодна і паведаміў у ЗША аб здарэнні ў Пінску. Міжнародная грамадскасць патрабавала правядзення следства, а асабліва Амерыканскі Чырвоны Крыж і французы [5, арк. 70]. Польскія ваенныя следчыя канстатавалі, што расстраляныя яўрэі былі бальшавікамі. Следчая камісія з польскага сейма не змагла нічога зрабіць. Тады была арганізавана міжнародная камісія на чале з Генры Маргентау, якую накіраваў прэзідэнт Вільсан. У справаздачы Г. Маргентау адзначаў, што ва ўсіх пагромах вінаваты ваенны час. Палякі і яўрэі былі незадаволеныя гэтай справаздачай. Ніхто не панес кары, і ўвогуле А. Лучынскі атрымаў у чэрвені 1919 г. чын палкоўніка. Аднак у гэтай гісторыі не ўсе так адназначна. Р. Месерман падаў інфармацыю ў брашуры : "...... отхода из города частей Красной Армии в нем осталась группа коммунистов для организации подпольной работы и партизанского движения. Подпольной большевистской организацией готовилась операция по освобождению политических заключенных из Пинской тюрьмы, но в партизанский отряд, который был назначен для проведения этой операции, пробрался провокатор. В результате легионерам удалось захватить часть партизан. В ночь с 5 на 6 апреля под стенами старого иезуитского монастыря были расстреляны 33 подпольщика [1, с. 42]. Сітуацыя заблытаная, незалежна ад таго, ці былі яўрэі камуністамі, чы не, польскае ваеннае кіраўніцтва не мела права расстрэльваць без суда і следства. Каб крыху залагодзіць яўрэяў, польскі ўрад пайшоў на дэмакратычныя выбары ў Пінску. Урад гарадской рады з 1 ліпеня 1919 г. складаўся з 5 палякаў, 4 рускіх і 12 яўрэяў [3, с. 402].

Калі новая ўлада ўсталёўвае новы парадак, то яна пільна стараецца выкрысліць з свядомасці чалавека законы, помнікі і назвы вуліц, тое што засталося ад старой улады. Польская ўлада, як толькі ўсталявалася ў Пінску, пайшла на перайменаванні вуліц. Вуліцы займелі назвы з польскай гісторыі : плошча 3 мая, вул. генерала Лістоўскага, Альбрэхтоўская, Дамініканская, Незалежнасці і інш. Планавалася таксама правядзенне мітынгаў на ўрачыстыя святы ў 1919 г. На сакавік – ліпень 1919 г. у асноўным прыпала 2

свята, гэта свята падпісання канстытуцыі 3 мая 1791 г., у гонар якой, якраз і насіла назву галоўная плошча Пінска, і другое свята – гэта падпісанне Люблінскай уніі 1 ліпеня 1569 г. Польскія ўлады на Палессі ў асноўным стараліся абапірацца на мясцовую шляхту і дваранства ў правядзенні сваёй палітыкі. У пацверджанне гэтага можна прывесці выпуск газеты "Unja", якая ў адрозненне ад большасці польскіх газет на тэрыторыі Беларусі выдавалася не толькі на польскай, а на рускай і палескай ( і палескай лацінкай) мове [6, с. 1–4].

**Малюнак 2. Адозва да жыхароў Палесся [6, с. 4].**



OBYWATELE!

1 Lipca 1569 r. zebrał się w Lublinie sejm, który uchwalił Unję Lubelską—Prawo, którym Litwa i Białoruś połączały się dobrowolnie z Rzeczypospolitą Polską.

Unja Lubelska jest wiekopomnym świadectwem, że Naród nasz i Rzeczypospolita nie orężem, lecz kulturą i sprawiedliwą gospodarką przyciągała do siebie sąsiadów.

Dla uczczenia 350-letniej rocznicy tej wielkiej idei połączenia się narodów pod hasłem wolni z wolnymi zawiążmy na Polesiu Komitety Rocznicy Unji Lubelskiej.

Niech wszystkie miasta powiatowe uczczą dzień 1-go lipca pochodem narodowym i żądaniami wszystkich związków, cechów i organizacji odnowienia Unji Lubelskiej przez rozpisanie na Polesiu wyborów do Sejmu.

W Brześciu 2-go lipca niech się odbędzie uroczysty zjazd delegatów Polesia w celu przedłożenia Konstytucyjnej Komisji Sejmu żądania poleszuków aby odnowionem było prawo przez dziadów naszych uchwalone—prawo Unji wolnych z wolnymi, aby posłowie Polesia w tym Sejmie prawodawczym mogli wspólnie radzić nad uchwaleniem Konstytucji Rzeczypospolitej Polskiej.

Komitet Rocznicy
Unji Lubelskiej
w Pińsku.

HROMADIANE!

1-ho Lipca 1569 roku sobrausia u Lublini Litousko-Biłarusko-Polskij Siejm, kotoryj postanowiu prawo, szczo Litwa i Biłaruś z dobroj woli sojediniat'sia s Polszczej. Lublinskaja Unja heto wicznoji swidetelstwo toho, szczo polskij narod ne siłkom, a kulturoj i sprawedływym uprâulenjem złuczau do sebe susidow

Szczob otprazdnowaty 350 lit hodouszczyny hetoj wełykoj idei złuczenja narodow swobodnych so swobodnymi, orhanizujem na Polisji Komitety hodouszczyny Lublinskoj Unji.

Nechajże wsi powitnyje horoda otprazdnujut' dień pirszaho Lipca manifiestacjami i prihoworami wsieho naroda odnoulenja Lublinskoj Unji, objawłaja wybory na Polisji Posłow u Polskij Siejm.

2-ho Lipca treba u Bresti wybornym s Polisja s'ichatysia i prosyty Konstitucjonnuju Komisju Polskaho Siejma odnowyty pradidowskoje prawo Unji (sojedinenja) wolnych s wolnymi; szczob posły Polisja u Siejmi Prawoutwierditelnom mohły razom sowitowat'sia ob postanoulenji Konstytucji Polskoj Rieczy Pospolitoj.

Komitet Hodouszczyny
Lublinskoj Unji
U PYNSKI.

ГРОМАДЯНЕ!

1-го Липца 1569 року собрауся у Люблини Литоуско-Биларуско-Польскій сейм, который постановыу право, що Литва и Биларусь с доброй воли соединяться с Польщей.

Люблинская Унія гето вичное свидетельство того, що польскій народ нэ силком, а культурой и справэдлывым упраулеліем злучау до сэбэ сусидов.

Щоб отпраздновати 350 лит годоущины гетой вэлыкой идеи злученья народов свободных со свободными, организуем на Полисьи комитет годоущины Люблинской Унін.

Нэхайже вси повитные города отпразднуют день 1-го Липца манифестацьями и приговорами усего-народа одноуленья Люблинской Уньи об'являя выборы на Полисьи послов у Польскій Сейм.

2-го Липца треба у Брести выборным с Полисья с'ихатыся и просыты Конституцьонную Комисью Польскаго Сейма одновчты прадидовское право Ун... (соединенья) вольных с вольными, щоб послы Полисья у Сейми правоутвердительно моглы разом совитоваться об постаноуленьи Конституцьи Речи Посполитой.

Комитет годоущины
люблинской уньи
у Пынску.

— 4 —

З гэтай адозвы можна зрабіць вывад аб тым, што на Піншчыне польскія ўлады абапіраліся не толькі на мясцовых палякаў, якіх было мала, а яшчэ на мясцовую шляхту, якая мела сваю палескую адметнасць.

Падзеі сакавіка – ліпеня 1919 г., у перыяд кіравання ваеннай адміністрацыяй Піншчынай, унеслі яснасць у адносінах паміж палякамі і палешукамі, яўрэямі і інш. Польскія вайскоўцы праводзілі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва, палітыку палітычнага тэрора. Адным з лозунгаў якой быў : "калі ты яўрэй – бальшавік". Гэты лозунг упісваўся ў апраўданне яўрэскіх пагромаў, якія адбываліся пры захопе гарадоў і мястэчак польскімі войскамі. Польская адміністрацыя зразумела, што палітыка якая праводзіцца на Віленшчыне і Гродзеншчыне, не падойдзе для палескага рэгіёну. Таму было спланавана як мага хутчэй перадаць уладу з рук ваеннай улады ў рукі грамадзянскай.


1. Лозицкий, А.И. В поход по Пинщине / А.И. Лозицкий. // – Пинск : Пинская городская типография, 1958. – 56 с.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінска. – Мн.: БЕЛТА, 1998. – 557 с.
3. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 711 с.
4. Szejnert, M. Usypać góry. Historie z Polesia / M. Szejnert // – Kraków : Wydawnictwo Znak, 2015. – 375 s.
5. Komitet narodowy Polski w Paryżu. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. KNPP. Syg. 156. Akc. 4.
6. Unja. – 1 lipca 1919 r. – №1.
7. Миляков, Л. Б. Погромы на Украине, в Белоруссии и европейской части России в период Гражданской войны 1918–1922 гг. / Л. Б. Миляков // – Москва : РОССПЭН, 2007. – 1032 с.

8. Ісакаў, С. Утварэнне і дзейнасць польскіх органаў на Піншчыне ў адміністрацыйна–тэрытарыяльным кіраванні 1919–1921 гг. / С. Ісакаў // Белорусское Полесье как историко–культурный феномен: материалы Международного научного семинара (Пинск, 29 мая 2019 г.) / Сост.: Л.А. Авгуль, Д.Н. Бакун. – Минск: Центральная научная библиотека НАН Беларуси; Москва: ФБГУ науки Научный и издательский центр “Наука” РАН, 2019. – С. 73–77.

Репозиторий ПолесГУ

## MILITARY AND POLITICAL SITUATION IN PINSK AT MARCH – JIUNE 1918

***Siarhei Isakau***
*Institute of History the National Academy of Science of Belarus, Minsk, Republic of Belarus,*
isakow.sergei@yandex.by

**Summury:** The article discusses the political and military situation in March-July 1919 in the territory of Pinsk district. Particular attention is paid to the Polish troops who captured Pinsk. The article is intended primarily for specialists and researchers of the history of the Polish-Soviet war, historians, as well as for everyone who is interested in the military history of Belarus

***Keywords : military administration, field gendarmerie, self management***